ЛЕТНІ ЗАКУП

СТРАТЭГІЯ ВЯСКОЎЦАЎ:

«Пакуль ёсць магчымасць здаваць малако, будзем трымаць кароў»

ЖЫХАРЫ Канюхоўскага сельсавета, што ў Бераставіцкім раёне, — у ліку актыўных здатчыкаў малака. У дзень яго паступае адсюль на прыёмны пункт амаль тона. У каго па некалькі кароў, здаюць па 600—700 літраў у месяц. Кароўка-карміліца дазваляе значна палепшыць фінансавы стан вяскоўца, па сутнасці, дапамагае свайму гаспадару зарабіць яшчэ адну вясковую зарплату.

Але каб селяніну выйсці на прыбытак, патрэбны дзве важныя ўмовы. Па-першае, танная кармавая база, а, па-другое — магчымасць здаць малако на месцы. У Канюхоўскім сельсавеце гэтыя ўмовы поўнасцю выконваюцца, таму тут і здатчыкаў малака больш. Гэта адзіны сельсавет раёна, дзе колькасць малочнага статка ў насельніцтва дасягае 80 галоў. Для параўнання, у Пагранічным сельсавеце — 10, у Бераставіцкім — наогул адзінкі. Пры такіх аб'емах закуп малака на тэрыторыі згаданых сельсаветаў не вядзецца.

Разам са **старшынёй Канюхоўскага сельскага Савета дэпутатаў Віталем РУДКІНЫМ** наведваем вёскі, дзе трымаюць кароў. Дарэчы, з 29 населеных пунктаў малочны статак маюць 11.

— У кожнай вёсцы ёсць пашы для жывёлы. Тэрыторыя абкошваецца альбо сіламі гаспадаркі, альбо самімі вяскоўцамі, — адзначае Віталь Мікалаевіч.

У вёсцы Глебавічы накіроўваемся да сядзібы Сцяпана Саўко. У гаспадара-пенсіянера тры каровы, ён лічыцца адным з найлепшых здатчыкаў — у красавіку здаў каля 600 літраў малака. Кожны дзень разам з жонкай атрымліваюць па 70 літраў, з якіх 60 ідзе на прыёмны пункт. Магчымасць здаваць малако — галоўная ўмова ўтрымання прыватнага статка. Вядома ж, невялікая частка ідзе і на ўласныя патрэбы — на выраб тварагу ці нават масла, але для гэтага дастаткова і адной каровы, кажа Сцяпан Іосіфавіч. Пакуль ёсць магчымасць здаць малако, можна трымаць і некалькі жывёл. У рэшце рэшт карову ўдалося набыць праз інтэрнэт за 1 тыс. долараў.

Месца збору малака ў вёсцы.

Як аказалася, мера гэта часовая, бо гаспадарка зараз займаецца пашырэннем і аднаўленнем статка. Праўда, нядаўна гаспадар сутыкнуўся з праблемай: ва ўсім наваколлі немагчыма купіць карову альбо цяля. Не рэалізуе жывёл і мясцовае сельгаспрадпрыемства.

Здаюць малако і ў сям'і Юрыя Аўдзея з суседняй вёскі Пачобуты. Разам з бацькамі трымаюць чатыры каровы. Юрый працуе ў мясцовым аддзяленні МНС, у сям'і трое дзяцей. Малочны статак ды яшчэ і агарод забяспечваюць дадатковы заробак. Гэта асабліва важна ва ўмовах рамонту дома, які вядзе маладая сям'я.

Каля сядзібы пасецца невялічкі прыватны статак. Усе жывёліны — чорна-пярэстай пароды. Тэрыторыя пашы агароджана дротам. Такія месцы для агульнага выпасу ёсць усюды, дзе трымаюць кароў. Юрый па магчымасці сам займаецца і нарыхтоўкай кармоў, але значную дапамогу аказвае мясцовая гаспадарка «Макараўцы». За здачу малака бясплатна выдзяляецца сена, 8—10 рулонаў на год. Заахвочваецца і здача цялят — акрамя грошай, гаспадар атрымлівае дадаткова кармы. Няма праблем і са здачай малака. Кожны ранак спецыяльны малакавоз ад прадпрыемства «Малочны свет» аб'язджае населеныя пункты і забірае малако, якое вяскоўцы выстаўляюць у вызначаным месцы.

Як расказаў зборшчык Рамуальд Кабылянскі (ён працуе ў мясцовым сельгаспрадпрыемстве), штодзень ад жыхароў сельсавета паступае больш за 900 кг малака. У гэтым аб'ёме значная частка належыць самому Рамуальду Антонавічу, які трымае ажно шэсць кароў. Ён у ліку самых актыўных здатчыкаў. За красавік здаў 700 літраў. Толькі на адну дойку ідзе больш за дзве гадзіны, а падаіць трэба два разы. Некаторыя дояць і тры.

— На першую дойку трэба ўстаць у пяць гадзін, праз гадзіну у мяне выезд па зборы малака, трэба аб'ехаць усю 30-кіламетровую зону, — расказвае Рамуальд Антонавіч, — спраўляюся да 12 гадзін, затым вязу малако на бліжэйшы прыёмны пункт, адтуль яно ідзе на малаказавод.

> Збор малака — не стыхійная справа. Каб стаць здатчыкам, трэба зарэгістравацца, ідэнтыфікаваць карову, скласці на яе пашпарт. Сюды заносяцца ўсе звесткі — ацёлы, хваробы і г. д. За станам прыватнага статка сочыць калгасны ветэрынар. Дарэчы, лячэнне таксама бясплатнае.

— Пад асаблівым кантролем жывёлы, якім больш за 10 гадоў. Бярэцца аналіз і на антыбіётыкі. Патрабаванні да якасці малака вельмі высокія, — адзначае Рамуальд Кабылянскі.

За якасцю сочыць і старшыня сельскага Савета. Калі з вёскі паступіла «забруджанае» малако, неабходна ўстанавіць такога здатчыка — яму будуць выстаўлены штрафныя санкцыі. Наогул, малочная тэма — важная частка ў рабоце старшыні Канюхоўскага сельскага Савета. Аб тым, што ўсё арганізавана, як трэба, сведчыць і зацікаўленасць жыхароў. Нават даволі сталыя вяскоўцы не адмаўляюцца ад сваіх карміліц.

Вось і Юльян Ігнатовіч з вёскі Пачобуты адзін даглядае сваю пярэстую кароўку. Сам доіць, па магчымасці нарыхтоўвае сена, хоць яму ідзе 83-і год. Жвавага дзядулю мы знайшлі на агародзе, дзе ён акучваў бульбу. Побач акуратныя радкі цыбулі, морквы і іншай гародніны. Паводдаль — вуллі з пчоламі. Юльян Антонавіч больш за 20 гадоў жыве адзін, але па-ранейшаму вядзе гаспадарку. Кажа, што некалі зарабляў на вырошчванні агуркоў, тут была сапраўдная агурочная сталіца. За гэтыя сродкі купіў сынам кватэры ў Гродне, пачаў будаваць новы дом у вёсцы. Але паступова агурочны цэнтр змясціўся ў іншы рэгіён, а інфляцыя «з'ела» ўсе зберажэнні. Зараз асноўны прыбытак у пенсіянера — гэта малако. Кожны дзень ён мае да 20 літраў, кошт 1 літра — 54 капейкі. Такім чынам за дзень можна зарабіць больш за 10 рублёў. Па выніках месяца ёсць надбаўкі.



Юрый АЎДЗЕЙ са старшынёй Канюхоўскага сельскага Савета Віталем РУДКІНЫМ.

Самы сталы здатчык — 82-гадовы Юльян ІГНАТОВІЧ.

Стараста вёскі Ігнатовічы Часлава Вансовіч за 10 дзён зарабіла 140 рублёў з адной каровы. Яна здае амаль усё малако, некалькі літраў купляюць мясцовыя жыхары. Жанчына сцвярджае, што заробак даволі істотны. Праўда, каровы патрабуюць дагляду, а каб было больш малака, іх трэба добра паіць. Напрыклад, зімой карова спажывае да 80 літраў вады ў дзень. У гаспадарцы ёсць парасяты, куры, трусы.

— У нас вельмі працавітыя вяскоўцы, — адзначае Віталь Рудкін, — усе, хто тут пастаянна пражывае, маюць гаспадарку. Некаторыя трымаюць коз, авечак. Мясцовае сельгаспрадпрыемства дапамагае і кармамі, і зернем. Малочны статак пакуль стабільны, а сёлета нават прыбавіўся адзін новы здатчык. Людзі бачаць, наколькі гэта выгадная справа.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

А ЯК У ВАС?

МАЛАКАЗДАТЧЫК, БУДЗЬ СУМЛЕННЫМ!

У раёнах паступова адыходзяць ад практыкі закупу малака ў насельніцтва сельгаспрадпрыемствамі.

Фота Анатоля КІПЕШЧУКА.

Здымак носіць ілюстрацыйны характар.

Дакладна па графіку

Усіх малаказдатчыкаў **Камянецкага раёна** ўжо некалькі гадоў абслугоўвае прыватнае прадпрыемства «БУШсэрвіс». А цяпер у зону абслугоўвання названага прадпрымальніка ўвайшло яшчэ некалькі сельсаветаў Брэсцкага і Жабінкаўскага раёна. Калектыў «БУШсэрвіс» налічвае зараз 13 чалавек.

Яго **дырэктар Анатоль ШВЕЙКУС** раней працаваў у штаце высокаўскага завода «Белавежскія сыры», па родзе работы — з малаказдатчыкамі. А потым не без падачы кіраўніцтва рашыў заняцца справай прафесійна. Так нарадзілася прыватнае прадпрыемства. Правільней сказаць, ідэя, якая атрымала матэрыяльнае ўвасабленне пасля пакупкі спецыялізаваных аўтамабіляў і найму кіроўцаў. Быў час, калі тут працавалі 12 шафёраў. Потым прайшла аптымізацыя, усе затраты старанна падлічылі, графікі скарэктавалі. Да таго ж тэхніка абнаўляецца, новыя машыны сталі больш эфектыўнымі.

— Зараз у нас працуе восем кіроўцаў, — расказвае Анатоль Швейкус. — Штодня на лінію выходзіць шэсць машын, двое шафёраў на выхадных. Нарыхтоўшчыкі збіраюць малако ў 144 вёсках. Значыць, у сярэднім на аднаго кіроўцу прыходзіцца 24 населеныя пункты, куды трэба заехаць, забраць малако ў гаспадароў, потым завезці ў нашу лабараторыю, пасля гэтага даставіць на завод.

Машыны «БУШсэрвіса» працуюць, нібы маршрутнае таксі, строга па графіку.

— Пяць хвілін прамаруджвання лічыцца ў нас недапушчальным, асабліва на першым маршруце. Час другога і трэцяга выездаў кіроўцы можа быць скарэктаваны лабараторыяй альбо непасрэдна заводам, што залежыць не ад нас. Тады малаказборшчык выбіваецца з графіка, але людзі папярэджаныя, яны ведаюць, што трэба трохі пачакаць. У любым выпадку 460 малаказдатчыкаў з трох раёнаў абслугоўваем кожны дзень.

У свой час Анатоль Швейкус ездзіў вучыцца ў Еўропу. І работу ўласнага прадпрыемства імкнуўся выбудаваць дакладна і рацыянальна. На жаль, гаварыць пра стапрацэнтную скрупулёзнасць і сумленнасць сельскіх гаспадароў пакуль не даводзіцца, таму кантроль якасці малака становіцца адным з асноўных этапаў работы. У прадпрыемства ёсць тры свае лабараторыі: у Высокім, Чэрнях і Відамлі. Спачатку кіроўцы дастаўляюць малако ў найбліжэйшую лабараторыю, дзе спецыяліст робіць аналіз. Калі якасць выклікае нараканні, сыравіна вяртаецца гаспадарам. Добрае малако дастаўляецца на завод, дзе яго правярае заводская лабараторыя.

(Заканчэнне на 14-й стар. «МС».)